10 № 62 (2496) Нумар 6 кап.

# ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА І МенГК ЛКСМБ

## БУДЗЕМ ЯШЧЭ ЛЕПШЫМІ ПАМОЧНІКАМІ МАГУТНАЙ БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ

### *Сакратару ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО Н. Ф.*
### *Старшыні СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ Н. М.*

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ЛКСМБ АД ІМЯ КОМСАМОЛЬЦАЎ І ПРАЦОЎНАЙ МОЛАДЗІ РЭСПУБЛІКІ ШЛЕ ВАМ ПАЛКАЕ КОМСАМОЛЬСКАЕ ПРЫВІТАННЕ І ВІНШУЕ ВАС З УЗНАГАРОДАЙ САЮЗНАГА ЎРАДА ОРДЭНАМ ЛЕНІНА.

МЫ ГАНАРЫМСЯ ГЭТАЙ УЗНАГАРОДАЙ, БО Ў ЁЙ УВАСОБЛЕНА ВАША ЎМЕЛАЕ І НЯСТОМНАЕ КІРАЎНІЦТВА БОЛЬШЭВІКАМІ, ПРОЛЕТАРЫЯМІ І КАЛГАСНІКАМІ СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ВЫКАНАННЕ УКАЗАННЯЎ ТАВАРЫША **СТАЛІНА**, ЗА СОЦЫЯЛІЗМ.

ОРДЭН ЛЕНІНА АБАВЯЗВАЕ НАС, ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ—ВЕРНЫХ СЫНОЎ І ДОЧАК ВЯЛІКАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ—БЫЦЬ ЯШЧЭ ЛЕПШЫМІ ЯЕ ПАМОЧНІКАМІ Ў СПРАВЕ ЎМАЦАВАННЯ БССР—НАДЗЕЙНАГА ФАРПОСТА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЫ.

У БАРАЦЬБЕ ЗА НОВЫЯ ПЕРАМОГІ МЫ БУДЗЕМ ВЫХОЎВАЦЬ МОЛАДЗЬ У ДУХУ НЕПРЫМІРЫМАСЦІ ДА КЛАСАВАГА ВОРАГА, У ДУХУ БЕЗЗАВЕТНАЙ АДДАНАСЦІ СПРАВЕ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА.

ПАЛКАЕ ПРЫВІТАННЕ КАПІТАНУ КРАІНЫ СОВЕТАЎ, НАШАМУ ДАРАГОМУ НАСТАЎНІКУ, ВЯЛІКАМУ **СТАЛІНУ!**

НЯХАЙ ЖЫВЕ КІРАЎНІК БОЛЬШЭВІКОЎ БЕЛАРУСІ ТАВ. **ГІКАЛО**, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЯКОГА БЕЛАРУСЬ СТАЛА ОРДЭНАНОСНАЙ РЭСПУБЛІКАЙ.

САКРАТАР ЦК ЛКСМБ **АЎГУСТАЙЦІС.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ